Cana 10 hr. Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 51 (692). Wilnia, Niadziela 13 Śniežnia 1936 h. Hod XII (XX)

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i literaturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

„Фронты“ і Беларусы

Цяпер пайшла мода на рознага роду «фронты». Аб гэтым поўна ў газэтах і ў палітычных нарадах. Аб «фронтах» сяньня ўжо ведаюць шырокія народныя масы. Нямала спатыкаем так-жа гутарак аб гэтай справе і сярод беларусаў.

Першыя тварыць «фронт» падалі думку камуністы на прошлагоднім кангрэсе Камінтэрну ў Маскве. Фронт гэты назвалі яны народным, дэмакратычным. У гэты фронт мелі ўваходзіць апрача камуністаў так-жа розныя іншыя палітычныя дэмакратычныя арганізацыі.

Першыя пробы рэалізацыі гэткага фронту пачаліся ў Францыі. Фронт гэты існуе і кіруе Францыяй і сяньня. Фармальна належаць да яго і камуністы, але фактычна ўжо яго не падтрымліваюць, бо яны, камуністы, ў гэным фронце не змаглі верхаводзіць і пераняць паволі ў свае рукі ўладу. Усе-ж іншыя дэмократычныя французкія партыі, якія ўвайшлі ў гэны «Народны Фронт», верхаводзтва ніякага не прызнаюць і далей трымаюцца свабоднага дэмократызму.

Падатны так-жа грунт для «Народнага Фронту» аказаўся і ў Гішпаніі. І тут уладу ў свае рукі забраўшы быў блёк дэмократычных партыяў, ня выключаючы і камуністаў. Ведама, і тут камуністы магчыма імкнуліся-б да таго, каб забраць уладу ў свае рукі, ці аднак гэта ім удалося-б, гаварыць трудна, бо ў Гішпаніі, як ведаем, проціў «Народнага - Фронту» паднялі паўстаньне ўсе партыі недэмократычныя, ці як іх называюць — фашысты. Пры гэтым трэба ведаць, што гішпанскія фашысты паднялі крывавае паўстаньне проціў «Народнага Фронту» ў сваей-жа бацькаўшчыне Гішпаніі не самастойна, не самі сваім адумам, а з нагавору і ў змове з фашыстамі нямецкімі —гітлероўцамі і фашыстамі італіянскімі, якія ад пачатку паўстаньня памагалі гішпанскім паўстанцам-фашыстам і якія памагаюць ім сяньня.

Такім чынам фактычна стварыўся проціў «Народнага Фронту» „Фронт Фашыстаўскі“. Гэтыя два фронты борацца сяньня ў Гішпаніі, прыймаючы штораз шырэйшыя разьмеры. Каля „Народнага Фронту“ гуртуюцца ўсе партыі дэмократычныя, а так-жа камуністы і — даняваўна — паднявольныя Гішпаніі народы — каталёнцы і баскійцы. Гэтаму фронту памагаюць бальшавікі. Каля „Фашыстаўскага Фронту» гуртуюцца правыя гішпанскія партыі, у склад якіх пераважна ўваходзяць розныя капіталісты і памешчыкі. Гэты Фронт падзержваюць Нямеччына і Італія.

Ужо з гэтага бачым, што ў Гішпаніі б'юцца між сабой два вялікія міжнародныя Фронты. Тымчасам нядаўна сталіся ў міжнароднай палітыцы факты, якія сьведчаць аб тым, што «Фашыстаўскі Фронт» яшчэ больш павялічваецца і пашыраецца. Так напрыклад аказваецца, што між Нямеччынай і Японіяй ёсьць падпісаны дагавор. Праўда, дагавор гэты быццам мае на думцы супольнымі сіламі, падпісаўшых яго, бароцца паліцыйнымі спосабамі з камунізмам. Аднак знаўцы кажуць, што дагавор гэны мае мэты шмат глыбейшыя, што ён сьціраваны прадусім проціў СССР, што Нямеччына і Японія маюць супольна пайсьці вайной на Саветы.

Апрача гэтага ўзмацаваўся „Фашыстаўскі Фронт“ і ў сярэдзіне Эўропы, бо так-жа падпісаны дагавор між Нямеччынай і Італіяй. Да гэтага-ж ствэрыліся адносіны больш чым „добрыя“ між Італіяй і Японіяй. Італія прызнала Манджурыю, а Японія прызнала заваяваньне Італіяй Абісыніі.

Вось-жа гэты «Фашыстаўскі Фронт» у гэткім вялікім і магутным міжнародным разьмеры слушна непакоіць і паважна трывожыць народы, што жывуць на ўсход ад Нямеччыны. Непакояцца гэтым некаторыя, асабліва дэмократычныя, слаі грамадзянства польскага, непакояцца дзяржавы надбалтыцкія, трывожыцца Чэхаславаччына, а так-жа грамадзянства украінскае і беларускае. Так напрыклад, «Robotnik» нядаўна аб гэтым пісаў гэтак: ...„Пакт нямецка-японскі можа давесьці да таго, што Нямеччына атрымае вольную руку на Усходзе Эўропы і будзе гразіць Польшчы як мірнай бар'еры між Нямеччынай і Саветамі.“ Адгэтуль просты выснаў, што-б азначала гэткая нямецкая ў палітыцы «вольная рука» і для беларускага народу і для яго краю.

Усе гэтыя азнакі імпэр'ялістычных праяваў міжнароднага фашызму, за выняткам некалькіх беларускіх фашыстаў-угадоўцаў, якія апошнім часам выявіліся на віленскім грунце, як даношчыкі, трывожаць так-жа і грамадзянства беларускае і змушаюць яго адпаведнае да гэтага ўсяго заняць становішча. Здаецца, не памылімся, калі скажам, што ўся незалежная беларуская палітычная думка разьвіваецца ня ў кірунку дыктатарскіх фронтаў, якія нясуць з сабой паняволеньне народаў і працуючых масаў, а ў кірунку вольнай дэмократыі.

Добра гэта выказала „Бел. Крыніца» ў № 23 з 17 траўня сёлета, у артыкуле „Народны Фронт“ і Беларусы“, калі пісала: „Беларускі народ у сяньняшні крытычны і важны час павінен зорка сачыць за палітычнымі ў Эўропе падзеямі, берагчыся тых усякіх сіл, што нясуць яму такую ці іншую няволю і эксплёатацыю, а шукаць сваіх самастойных ідэолёгічных і практычных дарог і так-жа шукаць сабе саюзьнікаў у тых дэмократычных кругох, якія нясуць яму ідэі поўнага вызваленьня і самаазначэньня. Агулам трэба адцеміць, што беларусы толькі ў такія палітычныя сувязі могуць уваходзіць, якія даюць ім магчымасьць вясьці іх самастойную нацыянальную палітыку. Лучыцца толькі з праўдзівай дэмократыяй і трымацца на ўласных нацыянальных нагах. Усякія іншыя камбінацыі— сьмерці падобныя“.

Гэтую-ж самую думку між іншым сканкрэтызавала і „Беларускае Народнае Аб'еднаньне“ (БНА) ў сваім камунікаце № 5 у пункце 7. Вось што там чытаем: ...„Трымацца сваей самастойнай ідэолёгіі і рэалізаваць яе згодна з сваей праграмай, супрацоўнічаючы з дэмократыяй украінскай і літоўскай, а так-жа з дэмократыяй іншых народаў, якая спагадае ідэі поўнага вызваленьня і самаазначэньня Беларускага Народу“...

Treba ziamielnaj reformy

Warunki sučasnaha ludzkoha žyćcia źmianiajucca na ŭsim świecie. Tak žyć i tak pracawać wa ŭsich halinach našaha štodziennaha žyćcia, asabliwa ŭ ziemlarobstwie, jak žyli i pracawali našyja pradziedy, a nawat i našyja baćki, my — sučasnaje, maładoje pakaleńnie ŭžo siahońnia tak nia možam.

Tady byli inšyja žyćciowyja warunki; tady byli inšyja časy, tady byli inšyja žyćciowyja abstawiny.

Ciapier nia tolki kožny čaławiek, ale asobny narod, kožny kraj, asabliwa my, biełarusy, pawinny ŭmieła wykarystać wypraktykawanaje inšymi. My musim prytarnawacca da swaich žyćciowych abstawin i pawinny mieć plan naprawy i pierabudowy swajho haspadarčaha i hramadzkaha žyćcia. Prosta kažučy — što jość wypraktykawanaje inšymi i dla nas padchodzić, jość dobraje i karysnaje — prymać, pryswojwać i zawodzić u siabie, a što nia dobraje — świedama acaniać i adkidać.

Heta byli-b prahramowyja šlachi dziela pierabudowy i palepšańnia našaha bytu.

Ab sialanstwie, ziemlarobstwie, ab naprawie žyćcia, padniaćci ziemlarobskaj kultury i ahułam ab usialakaj socyjalnaj reformie ciapier wielmi šmat usiudy haworać i pišuć. Haworać i pišuć mnoha tak-ža i ab ziamielnaj reformie. Ale ŭ praktyčnym žyćci, asabliwa ŭ žyćci našaha, biełaruskaha małaziamielnaha sialanstwa, hetyja sprawy wielmi zapuščanyja.

Mnoha ciapier haworać i pišuć ab zawiadzieńni planowaj haspadarki siarod małaziamielnaha sialanstwa. Widać, što jdzie niejkaja padhatoŭka dziela prawiadzieńnia abdumanaha planu i dla hetaj sprawy pračyščajecca teran dziejańnia. Teranam hetym maje być siało — haspadarka mała ziamielnaha sialanstwa.

Dyk zahlańma ŭ našaje, biełaruskaje siało i pryhledźmasia da žyćcia našaha małaziamielnaha sialanstwa.

U bolšaści kožny asobny sielanin u našaj, biełaruskaj wioscy maje ŭ spadku atrymanaj nadzielnaj ziamli 1, 2, 3, 4, da 5 i 6 dziesiancin; ziamla hetaja ŭ šniuroch daŭžynioj bolš wiarsty, a šyrynioj, što babie sieści. Jość jašče ŭ našych wioskach i h. zw. „ščaśliwyja“ sialanie, što majuć pa paławinie wałoki (ad 8 da 10 dz.) i nawat pa całaj wałocy (ad 16 da 20 dz.), ale hetkich „ščaśliwych“ nadta redka ŭžo los rassialiŭ pa našym krai.

Dyk ci moža pry takim ziemlaŭparadkawańni być zawiedziena niejkaja planowaja haspadarka? Jasna, što nie.

Pradusim nieadkładna treba skasawać u ziemlarobskaj haspadarcy šniury — treba raskidanuju ziamlu sabrać u adno miesca, treba pierawiaści sialan z šniurowaj haspadarki na haspadarku scelenuju. Słowam, treba prawieści komasacyju, treba pierabudawać ziemlaŭstrojstwa.

Ale ci komasacyja raźwiazwaje ziamielnuju sprawu biełaruskaj wioski i ci zaspakojwaje ziamielny hoład našaha sialanstwa?

Na hetaje pytańnie treba z usioj rašučaściaj adkazać, što komasacyja biaz pryrezki ziamli małaziamielnym haspadarkam ziamielnaj sprawy ŭ biełaruskaj wioscy nie wyrašaje i ziamielnaha hoładu našaha sialanstwa nie zaspakojwaje.

U takim stanie ziemlaŭparadkawańnia, jaki maje našaje sialanstwa u ciapierašnija časy ahulnaha suświetnaha haspadarčaha załamańnia, wioska našaja ŭściaž upadaje i haspadarča biednieje. Z takoj ziamielnaj haspadarki, jakuju maje naš sielanin, nia moža należna, paludzku sialanskaja siamja pražyć—nia tolki nia moža jak treba adziecca, abucca i wykanać swaje padatkawyja i inšyja abawiazki, ale nia moža paludzku prakarmicca, biez pabočnych siakich ci takich zarabotkaŭ.

Dyk dzie-ž wychad z hetaha pałažeńnia?

Tut wychad adzin: — prawieści ziamielnuju reformu tak, kab byli na-

24036

Спыненьне дзейнасьці Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры

Віленскія адміністрацыйныя ўлады 4.XII.1936 г. спынілі (завесілі) дзейнасьць Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры.

Цэнтральны Урад БІГіК падае супроць гэтай пастановы віленскіх адміністрацыйных уладаў рэкурс да вышэйшых уладаў у Польшчы.

dzieleny ziamloj biezziamielnyja, a takža byli nadzieleny da poŭnaziamiella i małaziamielnyja sialanie. Tolki hetkim sposabam možna dać mahčymaść našamu sialanstwu žyć paludzku i raźwiwać ziemlarobska-haspadarčuju kulturu.

Pryhetym treba źwiarnuć uwahu na pašyrańnie ŭ abšarnickaj presie pohladu, što hetkaja ziamielnaja reforma byccam škodnaja dla ahulnaha dabra i nia maje maralna-praŭnaj normy, kab sialan nadzialać toj ziamloj, jakoj ciapier uładaje ŭ dwary abšarnik.

Kali-b razważać nad hetaj sprawaj mazhami abšarnikaŭ, dyk možna było-b dajści da wywadaŭ, što i sami sialanie należać da dwaroŭ, bo jany kaliś chadzili na panščynu ŭ hetyja dwary. Ale razważajučy razumna i šukajučy sprawiadliwaści, dyk stanowicca jaśniej jaśnaści, što tyja ziemli, jakija zasialajuć biełarusy, jość krajem biełaruskim, a taja ziamla, što stanowić ziamielny warštat pracy, moža praŭna i pawinna należać da taho sialanstwa, jakoje ad niapamiatnych časoŭ na hetaj ziamli pracuje, jakoje ad niapamiatnych časoŭ z hetaj ziamli żyło i żywie ciapier.

U našym krai wyrabili ziamlu i prywiali jaje da pryhodnaści ziamielnych warštataŭ pracy nia biełyja ŭ rukawičkach ruki abšarnikaŭ, a mazalistyja ruki našaha sialanstwa. Hetuju ziamlu faktyčna abrablała našaje sialanstwa zdaŭnych, abrablaje jaje i ciapier; baraniła jaje ad wonkawych worahaŭ; paliwała i paliwaje jaje swaim potam; na hetaj ziamli żywie z dzieda-pradzieda aż da siańnia.

Dziela hetaha faktyčna i maralna, zhodna z zakonam Božym i ludzkim, hetyja ziemli pawinny należać našamu sialanstwu i nikomu inšamu.

Biaručy pad uwahu ŭsio wyšejskazanaje, my z całaj rašučaściaj ćwierdzim, što ŭ našym Krai biezadkładna treba prawodzić ziamielnuju reformu, pry jakoj byli b nadzieleny ziamloj biełaruskija sialanie biezziamielnyja i da poŭnaziamiella małaziamielnyja.

Sprawiadliwaja ziamielnaja reforma, na suproć ćwierdžańnia abšarnickaj presy, nia tolki nie paškodzić ahulnamu dabru, ale budzie ahulnaj sprawie karysnaj, bo ŭzmocnić i pašyryć ahulnaje dabro Dobraja sprawa nikoli nia maje naśledkaŭ zła.

p—k.

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

Беларуская дэлегацыя да польскага Ураду і Мітрапаліта Праваслаўнай Царквы ў Польшчы. Беларуская дэлегацыя, якая выехала з Вільні ў Варшаву 2.XII., да 10.XII. здолела дастаць аўдыенцыю ў Міністэрстве Асьветы і ў Мітрапаліта Прав. Царквы. Аўдыенцыя ў прэмера Ураду мае быць вызначана ў гэтым тыдні.

Раратры. У аўторак 8.XII. віленскія беларусы каталікі лядзілі ў касьцеле сьв. Мікалая традыцыйныя „Рараты". Гэтае набажэнства арганізавала Беларуская Каталіцкая Акцыя. Народу на „Раратах" было многа.

Рэфэраты. У нядзелю 6 XII. у беларускай залі — Вільня, Завальная 1—1, кс. Я. Гэрмановіч прачытаў II частку свайго рэфэрату „Манджурыя, край і людзі". У гэтай самай залі і ў гэты дзень адбыліся дыскусыйныя рэфэраты Беларускага Студ. Саюзу.

Беларускія грамафонныя пліты.

Ходзяць чуткі, што адна з найвялікшых грамафонных фабрык у Варшаве мае намер найграць сэрыю беларускіх пліт, асабліва песьні.

Урэшце беларускае грамадзянства ў Польшчы дачакаецца свайго роднага слова на плітах, бо дагэтуль кармілі нас чужымі.

Жыды зьмяшчалі, а ксяндзы не.

Беларусы каталікі, апрача іншых віленскіх газэт, зьвярнуліся так-жа і да „Gazety Wieczorowej" з просьбай зьмясьціць вестку аб Раратах для беларусаў. Польскія ксяндзы, ад якіх гэта газэта залежа, зрабіць гэта адмовіліся. А летась, калі гэта самая „Gaz. Wieczorowa" была ў руках жыдоў, дык вестку аб Раратах для беларусаў зьмясьціла ахвотна і дарма. Але, усяляк бывае на гэтым Божым сьвеце!... „Chr. D."

БЕЛАРУСЫ! Прысылайце ахвяры на фонд беларускай асьветы!

U niadzielu 13 śniežnia 1936 h., u zali im. Witaŭta Wialikaha pry Dombroŭskaha wul. Nr. 5 adbudziecca

AKADEMIJA-KANCERT p. n.

„Dzień Biełaruskaj Kultury"

U PRAHRAMIE:

Ustupnoje słowa i KANCERT pry ŭčaści: artysty opery M. Z.-SUMICKAHA (śpieŭ solo), praf. Kast. HAŁKOŬSKAHA i Biełaruskaha CHORU pad kiraŭnictwam hram. R. ŠYRMY.

Bilety ad 25 hrošaŭ da 2 zł. Pačatak a hadzinie 18-taj.

KAMITET DNIA BIEŁARUSKAJ KULTURY.

Браты Беларусы!

Толькі невялічкай частцы беларускай моладзі ўдалося пры сучасных нацыянальна-соцыяльных варунках жацьця Беларускага Народу дабіцца да унівэрсытэцкай лавы.

Але і тая малая жменька шчасьлівых мусіць разам з навукай стала змагацца з нягодамі жыцьця, з заўсёднымі нястачамі, з голадам і холадам, і таму часта ня можа належна разьвіваць свае здольнасьці, паглыбляць сваю веду, каб пазьней магчы нясьці асьвету свайму Народу, тварыць беларускую культуру, беларускую навуку.

Зарадзіць гэтаму ненармальнаму палажэньню можа толькі агульная помач Беларускага Народу, а перадусім беларускай вёскі. Мы знаем агульнае цяжкае палажэньне ўсіх Беларусаў, але трэба помніць, што нават малая помач будзе нам ня толькі падтрыманьнем матарыяльным але, — што важнейшае, вялікім падтрыманьнем маральным.

Сьведамасьць, што мы не пакінутыя на свае толькі сілы, што аб нас памятаюць, дасьць нам многа бадзёрасьці і веры ў перамогу ўсіх нягод і перашкод на дарозе да здабываньня веды.

Дык хай ня будзе ніводнай сьведамай беларускай вёскі, ніводнага Беларуса, які-б не зложыў свой грош на беларускага студэнта!

Хай кожны прыйдзе з помаччу патрабуючай студэнцкай моладзі — будучай культурнай авангардзе Беларускага Народу.

Заклікаем усё Беларускае Грамадзянства і Беларускія Арганізацыі і Інстытуцыі да дзейнай помачы беларускай студэнцкай моладзі.

Ахвяры просім слаць на адрас: Камітэт Месяца Бел. Студэнта Вільня, Завальная 1—1, Уладзімер Клім.

Камітэт Месяца Бел. Студ.
пры Бел. Студ. Саюзе У С.Б. у Вільні.

У братоў украінцаў.

УКРАІНСКАЯ КООПЭРАЦЫЯ.

Хто беспасярэдна сустрэўся з сяньняшнім украінскім жыцьцём у Галіччыне, той згодзіцца, што ня можна гэтага жыцьця прадставіць без коопэрацыі. Хто ж з гэтым жыцьцём папрабаваў пазнаёміцца, той ня може абараніцца ад думкі, што украінец ёсьць коопэратарам ад прыроды. Ня ёсьць гэта пахвала, але толькі сьцьверджаньне жывой праўды.

Коопэратыўны рух на розных украінскіх землях будзіўся ў розных формах і разьвіваўся з рознай сілай. На Вялікай Украіне (ў Наддняпраншчыне) коопэрацыя найперш праявілася ў форме супалак спажывецкіх: у 1865—66 г. у Елізавеце (Херсоншчына), у 1866 г. у Харкаве. Працавалі там М. Балін і М. Зібэр. Працоўныя коопэратывы ў форме земляробскіх арцеляў арганізаваў В. Левитський. З ідэолёгаў Наддняпранскай Украіны, апрача ўжо ўспомненых, трэба зазначыць такія імёны, як М. Драгоманів (1841—95), В. Доманицький, Хр. Барановський, ведамы эканаміст М. І. Барановський, які пад канец свайго плоднага жыцьця († 1919) прыймаў дзейнае ўчасьце ў украінскім жыцьці.

У Галіччыне (у той час пад Аўстрыяй) першым украінцам, які выступіў з думкай коопэратыўнага будаўніцтва, быў В.Нагірний (1848—1921), які так жа пачынаў з коопэрацыі спажывецкай. На грунце украінскай коопэрацыі крэдытовай першыя падставы клаў Др. Т. Кормош († 1927). Малачарскую коопэрацыю ўрэшце паставіў на цьвёрдыя ногі сьвяшчэньнік Астап Нижанківський (забіты ў 1919 г.).

Сягоньня стан украінскай коопэрацыі ў Галіччыне прадстаўляецца гэтак:

Найвышэйшае кіраўніцтва ўсяе украінскае коопэрацыі знаходзіцца ў руках Рэвізыйнага Саюзу Украінскіх Коопэратываў (РСУК), заснаванага ў 1934 г. як „Краёвы Рэвізыйны Саюз". Гэты саюз працуе ў кірунках: інструктарска-рэвізыйным, арганізацыйна і праўна дапамаговым, культурна прасьветным і прапагацыйна выдавецкім. Да часу апошняй зьмены польскага закону аб коопэратывах (1934 г.), Рэв. Саюз Укр. Коопэратываў абыймаў сваей дзейнасьцю ўсе землі, дзе толькі жывуць украінцы пад Польшчай. Законам з 1934 г. дзейнасьць Саюзу агранічана да абшару трох толькі ваяводзтваў у Галіччыне: Львоўскага, Станіславаўскага і Тарнопальскага. Украінскія коопэратывы на Валыні, Палесьсі і Холмшчыне ад гэтага часу ня могуць належаць да РСУК і змушаны належаць да саюзаў польскіх. Гэтым-жа законам значна звужана дзейнасьць Саюзу ў кірунку культурна-прасьветным і выдавецкім.

Не зважаючы на гэткія труднасьці і агранічэньні, Рэв. Саюз Укр. Коопэратываў далей вельмі прадуктыўна дзеіць, надаючы кірунак усей саюзнай украінскай коопэрацыі ў Польшчы і служачы прыкладам для коопэрацыі нават польскай і заграцічнай. Дзякуючы гэтаму самаму, Рэвіз. Саюз ёсьць дзейным сябрам Міжнароднага Саюзу Коопэратываў, куды належаць пераважна толькі саюзы народаў дзяржаўных.

Поўная самавыстарчальнасьць усяе украінскае коопэрацыі, згуртаванае ў Рэвізыйным Саюзе Укр. Коопэратываў пазволіла ёй шчасьліва перетрываць сусьветны гаспадарскі крызыс і нават падчас яго значна пашырыцца.

Старшынёй Рэвізыйнага Саюзу ёсьць сэнатар інж. Ю. Павликовський, а галоўным дырэктарам сэнатар Астап Луцький. Месьціцца Саюз у Львове, пры вул. Міцкевіча 12; у хуткім аднак часе мае перанесьціся ў собскі будынак пры вул. Тэхніцкай № 1.

Калі гаварыць аб паасобных відах украінскай коопэрацыі ў Польшчы, дык трэба яе з большага прынамся падзяліць на коопэрацыю: спажывецкую, крэдытовую, земляробска-вытворчую і гэтак званую „розную". Дзеля таго, што іншыя запатрабаваньні чалавека — жыхара места, а іншыя ў жыхара сяла, дык і спажывецкая коопэрацыя ў галіцкіх украінцаў сягоньня мае асобную цэнтралю для места („Народна Торговля") і асобную для сяла („Цэнтрасаюз").

„Народна Торговля".*) Закладчыкам „Народнай Торговлі" зьяўляецца архітэкт В. Нагірний. Першае коопэратыўнае таварыства п. н. „Народна Торговля" было заснавана 5 ліпня 1883 г. Ейнай мэтай было стацца арганізацыйнай цэнтраляй для спажывецкіх, спачатку сельскіх і гарадзкіх крамаў, купляць для іх таннец тавар з першай рукі і гэтым спосабам змагацца проці шалеючага і бязмежнага вызыску крамнікаў і пасярэднікаў. Праз пяць гадоў „Н. Т." згуртавала гэтак каля сябе блізу 130 крамаў, якія аднак у працы сваей не кіраваліся коопэратыўнымі правіламі. Гэта падрывала ў людзей давер да коопэрацыі. Ня бы-

*) паводле Д-ра К. Коберськага: Кооперативний буквар, Львоў.

U Litoŭcaŭ

Wydawiectwa Litoŭskaj Encyklopedyi pracuje spraŭna j chutka. Užo pačaŭ wychodzić u świet tom IX-y. Litoŭskija hazety zaznačajuć, što litoŭskaja encyklopedyja wydajecca chutčej, jak encyklopedyi krajoŭ staroj kultury: napr. encyklopedyja francuskaja D' Alambert i Didekot wydawałasia 10 hadoŭ. Niekatoryja inšyja encyklopedyi wychodzili bolš jak praz 85 hadoŭ. Litoŭskaja Encyklopedyja budzie wydana nie paźniej jak praz 10 hadoŭ.

Socyjalnaja apieka ŭ Litwie raźwiwajecca duža pamysna. Isnuje tam 200 ŭstanoŭ socyjalnaj apieki. Z ich — 5 dziaržaŭnych, 50 — samaŭradawych i 145 — dabradziejnych tawarystwaŭ. Z hetych ustanoŭ karystaje 8.600 asob. Dziaržawa na mety socyjanalnaj apieki praznačaje wializarnyja sumy — što hodu da 3 mil. 700 tys. litaŭ.

*

T-wa mastactwa j litaratury. U Wilni ad niekatoraha času pamysna pracuje i raźwiwajecca T-wa mastactwa j litaratury. T-wa heta maje na mecie: arhanizawać muzei, biblijateki i čytalni, naładžwać wystaŭki, abjaŭlać konkursy, wydawać adpawiednyja knižki i časapisy i h. d. 25.XI sioleta hetaha T—wa adbyłosia ahulnaje sabrańnie. Z sprawazdačy widać, što jana pracuje sapraŭdy pamysna.

Spyniena dziejnaść litoŭskich arhanizacyjaŭ. Administracyjnyja ŭłady spynili dziejnaść Litoŭskaha Nacyjanalnaha Kamitetu, a tak-ža T-wa św. Kazimiera.

З украінскай выдавецкай нівы

Украінскае Проціўалькагольнае Таварыства „Відродження“ ў Львове прыслала ў рэдакцыю „Бел. Крыніцы“ наступныя свае выданьні дзеля рэцэнзіі: 1) кішанковы каляндарык „Відроджэння“ на 1937 год, старанна выданы, з прыгожымі ілюстрацыямі, каштуе ўсяго 10 гр., 2) „Алькоголізм і народне господарство“—кніжачка, напісаная інж. Іванам Прокопавым, мае 40 стр., фармату 16°. Цана—40 гр., 3) „На роздоріжжі“ або „За і проті алькоголю“ — кніжыцу напісаў праф. Ю Каменецькый, мае 80 стр., фармат 16°. Цана — 80 гр. Усе вышэйназваныя кніжачкі даюць многа цікавага матарыялу на тэму шкоднасьці алькаголю і спосабу барацьбы з ім. Выпісаць іх можна па адрасе: Т-ва „Відроджэння,“ Львоў, вул. Чарнэцкага № 26.

Якая роля газэты „Беларускі Фронт“?

Сёлета ў чэрвені пачаў у Вільні штомесяц выходзіць „Беларускі Фронт“. Гэтую газэціну падпісвае трох людзей разам з адказным рэдактарам. Дасюль выйшла „Бел. Фронту“ ўжо 7 нумароў, у якіх напрасна хто шукаў-бы нейкага беларускага ідэолёгічнага кірунку, — такога там няма! У гэтых 7-мі нумарох „Бел. Фронту“ ёсьць толькі дзяленьне беларускага адраджэнскага руху на чужацкія арентацыі, нэгуючы гэтак беларускае народнае адраджэньне.

Увесь беларускі рух „Беларускі Фронт“ падзяліў: на „саветафільскі“, „літвафільскі“, „палёнафільскі“, „германафільскі“, „латышафільскі“ і на „украінафільскі“. Можна спадзявацца, што „геній“ рэдактара „Бел Фронту“ створыць сярод беларусаў кірунак і „гонолюлёфільскі“.

Каму і нашто гэта ўсё патрэбнае?.. Хіба-ж дзеля забаўкі гэтага не рабілася...

У суботу 28 лістапада сёл. адбыліся ў Вільні ў беларускіх арганізацыях, установах і ў многіх беларусаў паліцэйскія рэвізіі.

У рэдакцыі „Беларускага Фронту“ рэвізіі ня было...

Абразіўся „Беларускі Фронт“ і ні з сяго ні з таго нападае за гэта на нас.

Словам, пачуўся „Бел. Фронт“ чамусьці „пакрыўджаным“, што ў яго рэдакцыі паліцыя не зрабіла рэвізіі.

Дзіўныя прэтэнсіі... Вось у рэдакцыі „Роднага Краю“ рэвізіі ня было і ён за гэта не абражаецца і да нікога ніякай прэтэнсіі ня мае.

Пры гэтым мусім выпрастаць крывізну інфармацыі „Бел. Фронту“ ў справе Рады Б.І.Г. і К.

Сход Рады Б.І.Г. і К. 15.XI. г. г. сапраўды не адбыўся. Каб так было, як інфармуе „Бел. Фронт“, дык гэта было-б не статутова і дзеля гэтага шкодна для Б.І.Г. і К.

Сход гэты быў склікаsuccessfully на жаданьне Рэвізыйнай Камісіі не дзеля вырашэньня супольнага ці аддзельнага сьвяткаваньня юбілеяў Б.І.Г. і К. і Т. Б. Ш., але дзеля разгляду скаргі на старшыню БІГіК.

Дык якая роля „Беларускага Фронту“ сярод беларусаў?..

На гэтае пытаньне адказвае яго пісаніна і ўсялякія паясьненьні яе зусім лішнія.

Беларускі адраджэнскі рух падобнае супроцьдзеяньне перажыў ужо не адно, дык пакіне на сваім шляху, у рове адкосу, і „Беларускі Фронт“.

Ameryka abjednywajecca i pieraścierahaje świet ad wajny

My ŭžo pisali, što amerykanskija dziaržawy imknucca da ahulnaha abjednańnia i stwareńnia adnaho sajuzu ŭsich dziaržaŭ Ameryki.

Woś u hetaj sprawie ŭžo pačalisia ahulna amerykanskija kanferencyi. Na adčynieńni pieršaj hetaj kanferencyi ŭ Buenos Aires prezydent Zł. St. Paŭnoč. Ameryki Ruzwelt skazaŭ pramowu, u jakoj adznačyŭ, što siamja amerykanskich narodaŭ žywie miž saboju suładna i nia trywožycca biespraryŭnaj pahrozaj wajny, dajučy hetym dobry prykład inšym narodam druhich kantynentaŭ świetu. Dalej Ruzwelt kazaŭ — my sabralisia nie dzialić wajennych zdabyčaŭ, ale dziela taho, kab ućwiardzić mir; adnak inšym čaścinam świetu hrazić strachaćcio wajny; wieru, što ludzi na ŭsim świecie chočać žyć spakojna, adnak urady imknucca da wajny. Bačym kantyneniy, što raździrajuć siabie daŭniejšaj nienawiściaj i nowymi fanatyzmami; čujem damahańni, kab likwidawać niesprawiadliwaść i niaroŭnaść aružžam, a nie šlacham mirnaj sprawiadliwaści; wiedajem, što ŭsiudy zbrojacca i hatowiacca da wajny. Wajna ŭ inšych čaścinach świetu začapiła-b i Ameryku. My — respubliki nowaha świetu — možam pryčynicca dziela spynieńnia niebiaśpieki wajny. Naŭpierad musim skasawać nazaŭsiody ŭsialakija mahčymaści wajny miž nami, a paśla pryčynicca da adbudowy dabrabytu na świecie. Wyjaŭlajem naš dawier da zachodniaha świetu i zajaŭlajem, što budziem trymacca demokratyčnaha ładu i budziem hetuju formu ładu ad usialakaj napaści baranić. Hetaja našaja wiera była-b nie daskanalnaja, kab adnačasna nie padčyrknuli našaj wiery ŭ Boha, zahwarantawanaj ŭ našych kanstytucyjach parahrafami wolnaści sumleńnia.

Na hetkich padstawach, na padstawach wolnaha i swabodnaha demokratyzmu abapiorłasia i dalej abiacaje hetkaha ładu trymacca Ameryka. Z pedastału demokratyzmu zusim słušnyja pieraściarohi Ameryki dla Eŭropy, jakaja, raźminuŭšysia z praŭdaj, šukaje sprawiadliwaści ŭ sile aružža.

Baski ŭ ahni hišpanskaj chatniaj wajny

Hišpanskaja chatniaja wajna — aružnaja baraćba respublikancaŭ z paŭstancami fašystymi — nia spyniajecca i dalej zawastrajecca. U ahni hetaj wajny Baski i Katalоncy cierpiać ad fašystaŭ nie jak respublikancy, ale jak asobnyja narody, što imknucca da swajho samastojnaha bytu.

Katalickaja francuskaja, kamisija daśledziŭšy na miascoch ciapierašniaje pałažeńnie Baskaŭ śćwiardžaje, što niadaŭna paŭstancy fašysty hien. Franko rastralali 19 baskijskich katalickich ksiandzoŭ i aryštawali dwuch baskijskich biskupaŭ. Pryhetym kamisija śćwierdziła, što respublikanski ŭrad u baskijskim krai adnosicca da baskijskaha duchawienstwa z pašanaj i naležnaj apiekaj; baskijski narod lubić swajo duchawienstwa i za jaho staić haroj.

Ministar Irujo—pawadyr Baskaŭ, u hutarcy z pradstaŭnikom presy, miž inšym, skazaŭ nastupnaje:

My, Baski, zaŭsiody byli praciŭnikami ŭsialakaj wajny, ale ciepier napaściaj fašystaŭ zmušany z imi wajawać. Ciapier my, Baski, trymajemsia centralnaha ŭradu, jaki stanowiać pradstaŭniki roznych partyjaŭ, u hetym liku i partyjaŭ baskijskich. Našyja adnosiny da Kaścioła takija — my staim pa jaho staranie, ale praciŭ taho, kab Kaścioł byŭ wajujučym. Našaje katalictwa maje charaktar ad palityki asobny, našaje katalictwa — heta sprawa duchowaja i maje charaktar demokratyčny. U kastylskich prawincyjach Hišpanii relihija apynułasia prywilejem bahatych, a ŭ nas — u Baskii ŭwieś narod hłyboka wieručy, jaki zaŭsiody zapaŭniaje kaścioły i šanuje swajo duchawienstwa, jakoje tak-ža maje hłybokaje pačućcio demokracyi i pierawažna pachodzić z narodnych masaŭ; baćka biskupa Pomplony, jakoha niadaŭna fašysty aryštawali, prosty rabotnik, a baćka aryštawanaha fašystymi biskupa Viktoryi zwyčajny pastuch.

Ministar adznačyŭ, što fašysty prasledujuć tych praŭdziwych ksiandzoŭ, jakija nia chočać z relihii rabić palityčnaha aružža.

Dalej ministar adznačyŭ, što baskijskaje duchawienstwa maje pryrodnuju łučnaść z narodam, bo pachodzić z hetaha narodu i łučycca z narodam u demokratyzmie, a dziela hetaha narod šanuje kaścioł i duchawienstwa. U Baskii pad uładaj respublikanskaha ŭradu nie spalany ani adzin kaścioł, nie zabity ani adzin ksiondz, a manaški śmieła ŭ swaich habitach chodziać pa wulicach miestaŭ.

Demokratyzm u Baskaŭ — kazaŭ ministar, užo stary i maje słaŭnuju tradycyju. U Baskaŭ klič „wolny hramadzianin wolnaha kraju“ — heta nakaz sprawiadliwaści; za pahlady, choć-by i supiarečnyja z palitykaj uradu, nichto nia moža być karany. U nas usie wolnyja i ŭsie čujucca swabodna — ćwierdzić pawadyr Baskaŭ.

Hetak pradstaŭlajecca wolnaść sumleńnia, swaboda relihijnaja i ahułam paniaćcie swabody Baskami.

Dyk i ničoha dziŭnaha, što ŭsie baskijcy razam i baskijskaje duchawienstwa, hetak zaŭziata baroniać demokratyčnaj swabody ad reakcyjnaj fašystaŭskaj napaści.

ло таксама фаховых кіраўнікоў у працы. Дзеля гэтага згуртаваныя ў „Н. Торговлі“ крамы памалу ўпадаюць і сама „Н. Торговля“ пераходзіць да арганізаваньня собскіх крамніцкіх складаў у розных гарадох Галіччыны на коопэратыўных падставах. Ад гэтага часу дзейнасьць „Н. Торговлі“ стала ўзрастае (у 1913 г. ўжо было сарганізавана 102 супалкі ды шмат коопэратыўных і некоопэратыўных крамаў) Сусьветная вайна нагэтулькі зьнішчыла працу, што ў 1917 г. толькі тры супалкі былі ў кантакце з цэнтраляй. Зараз-жа пасьля вайны дзейнасьць „Н. Торговлі“ нанова падыймаецца, і вядзецца больш як дагэтуль у кірунку коопэратыўным. У 1923 г. зьмяняецца статут Т-ва ў кірунку ператварэньня яго ў цэнтралю спажывецкай коопэрацыі ў гарадох. Гэты характар мае „Нар. Торговля“ і да сягоньня. Сябрамі „Нар. Торговлі“ зьяўляюцца як коопэратывы (асобы праўныя), так асобы фізычныя. Гэткі самы мяшаны характар маюць і ўлады (Наглядная Рада) „Нар. Торговлі“.

Ц э н т р а с а ю з — гэта арганізацыйная й гандлёвая цэнтраля спажывецкай коопэрацыі на сяле. Пачаў ён існаваць у 1899 г. у Перамышлі як коопэратыва 1-га ступня, якая абслугоўвала толькі сяло, гандлюючы: с.-гаспадарскімі машынамі і снасьцю, насеньнем, штучнымі гнаямі і г. п. Хутка, бо ўжо ў 1911 г. коопэратыва гэта пашырае сваю дзейнасьць далёка паза межы Перамышлю і таму пераносіцца ў Львоў, скуль пашыраецца на ўсю Галіччыну.

Вайна парабіла вялікія спустэшэньні ў працы гэтых коопэратываў. Але ўжо ў 1920 г. арганізаваўся ў Львове К.К.О.К. („Краевий Комітет Організації Кооператив“), які ў хуткім часе густой сеткай вясковых коопэратываў пакрыў увесь край. Гэтыя вясковыя спажывецка-гаспадарскія коопэратывы лучыліся ў Саюзы Паветавыя, каторыя ў 1923 г. злучыліся ў Саюз Паветавых Саюзаў, пазьнейшы Цэнтрасаюз. Да папярэдняй дзейнасьці гэтых коопэратываў далучыўся йшчэ збыт прадуктаў сельскае гаспадаркі: збожжа, сьвіні, яйкі і г. п. Акрамя таго гэтыя вясковыя коопэратывы агульнага закупу й збыту былі ў шмат мясцох школаю і калыскаю коопэрацыі гаспадарска-вытворчай і крэдытовай: пры коопэратывах арганізаваліся сэкцыі (аддзелы) малачарскія, цаглярскія, алеярскія, крэдытовыя і інш., якія з часам ставаліся коопэратывамі самастойнымі. Значэньне і карысьць гаспадарска-спажывецкай коопэрацыі, сарганізаванай праз П.С.К. (Паветавыя Саюзы Коопэратываў) ў „Цэнтрасаюзе,“ становіцца йшчэ выразьнейшым, калі прыняць пад увагу, што „Паветавыя Саюзы Коопэратываў“ утрымаўвуюць для сваіх сяброў акружных агрономаў, якія вельмі чынна памагаюць падыймаць даходнасьць сельскіх гаспадарак.

Ц э н т р а б а н к — гэта цэнтральная арганізацыя вясковых і правінцыяльна-гарадзкіх касаў ашчаднасьці. Вясковыя касы галіцкіх украінцаў арганізаваны паводле сыстэмы Райфайзэна і называюцца проста райфайзэнкамі; гарадзкія ж касы насьлядуюць узор Шульца Дэліцш і называюцца Украінбанкамі.

Заданьнем Цэнтрабанку ёсьць раздабыцьцё грашовых сродкаў на гаспадарскія прадпрыемствы. Наскольке спосаб гэткага раздабываньня ня лёгкі, нагэтулькі ён і арыгінальны. Арганізатары украінскіх касаў выходзілі з такіх меркаваньняў: перш чым браць пазычку, чалавек мусіць навучыцца ашчаджаць. Ня гэтулькі важна, каб чалавек зразу ашчаджаў шмат, але каб ён ашчаджаў с т а л а, напр. у тыдзень па 10, 20, 50 грашоў. А яшчэ важней, каб ашчаджалі не адзіночныя асобы, але каб ашчаджалі ў с е. Гэтак паўстала ў украінцаў думка гэтак званай масавай ашчаднасьці, якая сапраўды дала галіцкім украінцам патрэбныя да разьвіцьця грошы, а самым ашчаджаючым забясьпечыла будучыню*).

Пачаткамі сваімі „Цэнтрабанк“ сягае да 90-тых гадоў мін. стагодзьдзя, калі Д-р Кормош залажыў у Перамышлі крэдытовае таварыства „Віра“ (вера). За прыкладам Перамышля пайшлі іншыя мясцы, так што ўжо ў 1896 г. пачалі гаварыць аб патрэбе заснаваньня Саюзу крэдытовых коопэратываў. Арганізаваўся ж такі, „Краевий Союз Кредитовий“ толькі 1898 г., аб'еднываючы ў 1913 г. 906 праўных сяброў, палова якіх была крэдытовыя коопэратывы. Вайна зрабіла украінскай крэдытовай коопэрацыі шмат шкодаў, але пасьляваенны разгон украінскай коопэрацыі ў Галіччыне не пакінуў увонках і коопэрацыі крэдытовай: яна добра разьвіваецца, успамагаючы роднае гаспадарскае жыцьцё родным украінскім капіталам. На чале укр. крэдытовай коопэрацыі доўгі час стаіць заслужаны дзеяч Д-р К. Левицький.

*) Бліжэй аб масавай ашчаднасьці ў брашурцы А. Клімовіча: „Leki na ździeki“ — Вільня 1932.

Nowaja kanstytucyja SSSR zaćwierdžana

My padawali ū prošłych numaroch ab naradach Kanhresu Sawietaū SSSR, jaki sabraūsia dziela razhladu i zaćwierdžańnia prajektu nowaj kanstytucyi dla SSSR. Kanhres swaju rabotu ūžo končyū i kanstytucyju zaćwierdziū.

Kanhres Sawietaū zrabiū u prajekcie kanstytucyi ū 32 artykułach papraūki; rešta 114 artykułaū pryniaū biaz źmieny. Z hetych usich paprawak istotnaje značeńnie majuć tolki 6 paprawak, a imienna:

Da art. 8 dadana, što kałchozy karystajucca ziamloj biaspłatna; da art. 10 uwiedziena papraūka, jakoj pryznajecca prywatnaj ułasnaści, što jana pierachodzić na ūłasnaść spadkajemnikam prawam spadku.

Art. 35, jaki haworyć ab pradstaūnictwie sajuznaha sawietu, ustanoūleny, što kožnaja sajuznaja respublika pasyłaje pa 25 delehataū, a respublika aūtanomnaja pa 11 delehataū, kožny aūtanomny rajon pa 1 delehatu; art. 40 — što ūsie zakony wydanyja najwyšejšym sawietam SSSR buduć abwiaščacca ū mowach 11 sajuznych respublikaū.

Art. 48 ustanaūlaje, što budzie 11 zastupnikaū najwyšejšaha sawietu h.zn hetulki zastupnikaū, kolki jość sajuznych respublikaū.

Ciapier treba spadziawacca wybaraū u sawiety pawodle hetaj kanstytucyi. Wybary i pakažuć, jak praktyčna budzie wyhladać u SSSR nowy kanstytucyjny ład.

Z polskaha Sojmu i Senatu

Paśla adkryćcia budžetnaj sesii Sojmu i Senatu, pramowaū premjera ūradu hien. Sławoj Składkoūskaha, wice-premjera ministra Kwiatkoūskaha i niekatorych pasłoū, Sojm i Senat, wybraūšy specyjalnyja kamisii, plenarnyja pasiedžańni spyniū. Ciapier dziaržaūny budžet razhladajuć u kamisijach. Plenarnyja pasiedžańni Sojmu pačnucca ū druhoj paławinie hetaha m-ca.

Što skazaū u Sojmie ukrainski pasoł Mudryj? Pasoł Mudryj — staršynia Ukr. Parl. Reprezent. u swajej pramowie, miž inšym, skazaū:— ukrainskija pasły letaś u Sojmie padawali damahańni Ukraincaū, hałasawali za budžet i paūnamoctwy dla ūradu, a tak ža nastroili bolšaść ukrainskaha nasielnictwa tak, što na ukrainskaj terytoryi byū uwieś čas bolšy supakoj, čymsia na etnahrafična polskaj. I nie zważajučy na heta, ničoha nie źmianiłasia — ani ū halinie aświety, ani ū sprawach finansowych i haspadarčych, a nawat nia možna wyčuć imknieńnia z polskaha boku, kab uhruntawać nowy etap u adnosinach polska-ukrainskich. Niama nawat adnaje pazycyi ū budžecie, jakaja pakazwała-b, što ū Polščy jość 6 miljonaū Ukraincaū.

Što skazaū pradstaūnik Žydoū? Pasoł Rubinštejn, miž inšym, skazaū: — Ci možna spakojna hawaryć, kali nad hałowoj machajuć pałkaj i kastetam? Dziela hetaha treba hawaryć ab zabiaśpiečańni žyćcia. My spadziawalisia, što Wilnia budzie Šwajcaryjaj Uschodu, až tam 22 i 23.XI. u žydoūskuju hminu źjawiłasia 96 pabitych i h. d.

Pamior Lawon Wasileūski

U Waršawie 10.XII. siol. pamior wiedamy polski dziejač Lawon Wasileūski.

Niabožčyk šmat uwahi zwaročwaū tak-ža na sprawy biełaruskija i litoūskija. Z prac niabožčyka ū hetych sprawach šyroka wiedamaja knižka „Litwa i Białoruś“.

Roznyja wiestki

Z HAZET.

Ab wajennych planach Hitlera. U francuskaj hazecie „Echo de Pari“ anhielski karespandent padaje: Anhielskija wajennyja kruhi dobra wiedajuć plan Hitlera. Jon zaprapanuje Čechasławaččynie admowicca ad sajuzu z SSSR, bo Niemcy chočać praz čechasławackuju terytoryju jści na Ukrainu.

Hetyja plany Hitlera adnak nie ūdajucca, bo na heta nie zhadžajucca ani Čechasławaččyna, ani inšyja dziaržawy, jakija lažać na šlachu niamieckich namieraū pachodu na ūschod.

Tut treba adznačyć, što adpawiednyja sawieckija dyplomatyčnyja kruhi ū sprawie wystupleńnia Zdanowa dali zadawalajučaje wyjaśnieńnie nadbałtyckim susiedziam.

Žaniačka karala suproć konstytucyi ū Anhlii. Anhielski karol Edward VIII. 42 letni mužčyna dasiul nie žanaty i nia mieū achwoty žanicca. Biadawali anhielcy, što karol nia ženicca. Až raptam karol niespadzieūki pastanawiū žanicca z amerykankaj, dwojčy zamužniaj 41 hodniaj paniaj Simpson. Žaniačka karala Edwarda VIII z p. Simpson supiarečnaja z anhielskaj kanstytucyjaj — p. Simpson amerykanka i z prostaha zwańnia. Pačalisia kłopaty. Urešcie Edward VIII. zroksia z karaleūskaha pasadu i swabodna aženicca z p. Simpson. Na anhielski pasad zasiadzie kniaź Yorku — brat Edwarda VIII.

Hišpanskija fašysty nie pryznajuć niezaležnaści Katalonii. Pradstaūnik hien. Franko praz radyjo zajawiū. što ūłady paūstanskaha ūradu hien. Franko nikoli nie pryznajuć i nia zhodziacca na niezaležnaść Katalonii.

Z POLŠČY

Žmiena wajawodaū. Wałynski wajawoda Juzefski padaūsia ū adstaūku; polskaja presa padaje, što Paleski wajawoda Kostek-Biernacki tak-ža padajecca ū adstaūku.

Chaūtury: U minułym tydni ū Waršawie nahła pamior wilenski wicewajawoda K. Dziewiałtoūski-Gintowt.

Sanacyja šukaje demokratyčnaj bolšaści. U apartamantach Sojmu 1.XII. adbylisia narady sanacyjnych dziejačoū. Pastanoūlena stwaryć sajuz hramadzkich dziejačoū. U hety sajuz uwajšli: senatary Oliwiński i Malski, pasły: Sužycki, Dembicki, Nowak, Šumowski i Kopeć. Hety sajuz maje imknucca da stwareńnia ū Sojmie demokratyčnaj bolšaści.

Daūhi Polščy. Kantrolnaja kamisija dziaržaūnych daūhoū ustanawiła, što zadoūžanaść Polščy na 1.X. siol. była na 4 662.000.000 zł.

Z ZAHRANICY

Kanferencyja bałtyckich dziaržaū. U Ryzie adbyłasia ū min. tydni čarhowaja kanferencyja bałtyckich dziaržaū: Litwy, Łatwii i Estonii. Na kanferencyi abhawarwana, miž inšym, tak ža sprawa wystupleńnia na Kanhresie Sawietaū u Maskwie Zdanawa.

KUPLAJCIE

„Беларускі Сялянскі Календар на 1937 г.“ (кніжку),

a tak-ža

„Беларускі Адрыўны Календар на 1937 год“.

Piśmy z wioski

Školnaja sprawa.

Dziatława, Nawahradzkaha paw. Školnaja sprawa—heta wialikaja sprawa. Našyja sialanie heta wiedajuć i ab hetym miž saboju časta haworać. Ale hetaja sprawa maje ū sabie šmat trudoū i šmat chadoū. Music dziela hetaha našyja sialanie masawa nie biarucca za školnuju sprawu. Jość u nas samaachwiarnyja ludzi, ale jany adzinki i nia majuć mahčymaści addacca školnaj sprawie. A sialanskaja masa, razumiejučy ważnaść školnaj sprawy, čakaje pakul henyja adzinki ū hetaj sprawie nia woźmuć ūsich zachadaū na siabie, a tady jany (sialanie) padpišuć deklaracyi za rodnuju školu i daručać adnamu z ich ad ichniaha imiani wystupać da adpawiednych uładaū z damahańniem dla ichnich dziaciej biełaruskaj škoły.

Zwosieni była ū nas pačaūšysia enerhičnaja školnaja akcyja — padawańnia deklaracyjaū za biełaruskuju školu, ale jana spatkałasia z niepieramožnymi trudnaściami i dziela hetaha spyniłasia i raściarušyłasia.

Na moj pahlad, nia treba ahladacca na adzinki, jakija-b kirawali školnaj akcyjaj, ale treba samym za hetuju sprawu bracca i dastawać deklaracyi za biełaruskuju školu i samym ich padpisaūšy, padawać školnym ūładam. Kali-b usie sialanie padali deklaracyi za rodnuju školu, ja dumaju, što školnyja ūłady biełaruskuju školu adčynili-b.

Dyk biaremsia za hetuju zakonnuju i darahuju nam sprawu — padawajma školnamu inspektaru deklaracyi za rodnuju, biełaruskuju školu.

Ś l o z n a w o k i.

Nie wiasioła ū našaj wioscy.

Bielaūcy, Brasłaūskaha paw. Našaja wioska ūžo 10 hadoū tamu dbała ab padniaćci i pašyreńni biełaruskaj kultury. Tady było wiesialej, tady było swabadniej, tady pryjamniej žyłosia.

Ciapier usie ludzi chodziać pachmuranyja, niewiasiołyja; žywuć biez zaūtrašniaha dnia, aby da wiečara. Uwiečary ūwieś razrywak — ihra ū karty. Pry kartach pačynajecca pjanstwa — pjuć samahonku, pjuć i manapolku. Hetak robiać stalejšyja, hetak robić i moładź.

Braty, świaltejšyja Biełarusy! Zwiarniecie ūwahu na ciemnatu ū wioscy i starajciesia jaje praświacić. Prysyłajcie knižki, prysyłajcie ūsialakija žurnały i hazety ū wiosku i prysyłajcie ūsio, što pabudžaje da samaaświety.

Braty susiedzi! Kidajcie hulać u karty, kidajcie pić atrutu dušy i cieła, harełku, a biarecie ū ruki knižku, hazetu i ū wolny čas čytajcie. Hazeta i knižka wywiadzie Was z niawoli ciemry i pakaža šlach da lepšaha, światlejšaha žyćcia.

J. W i a z.

Z žyćcia moładzi.

Rajčanskaja woł., Nawahradzkaha paw. Našaja moładź patryjatyčnaja i stojkaja. Za swajo rodnaje staić haroj. Pryhetym treba adznačyć, što našaja moładź družnaja.

Ciapier apišu adno zdareńnie. Woś jano:

Z našaha prawasłaūnaha prychodu wykasawałasia miascowaja dziaūčyna i wyjšla zamuž za niatutejšaha katalika.

U nas taki zwyčaj, što na wiasielle moładź źbirajecca z cełaj wakolicy.

Na wiasielle-ž henaje dziaūčyny z čužym nichto z wakoličnaj moładzi nie pajšoū; u toj-ža wioscy, dzie było hetaje wiasielle, moładź naładziła tancawalnuju wiečarynu, i na wiasielle susiedki, jakaja wyjšla zamuž za čužoha, nia stupiła naha wiaskowaj moładzi. Mała hetaha, nawat muzykant, dawiedaūšysia ab usim, kinuū ihrać na wiasielli i pierajšoū da swajej moładzi na wiečarynu.

Heta byū bajkot za adračeńnie ad prawasłaūja i swajho narodu. Tut treba adznačyć, što za pierachod z prawasłaūja ū katalictwa biez adračeńnia swajho narodu ū nas nie bajkatujuć, bo miascowyja ludzi, ženiačysia prawasłaūnyja z katalikami, nia robiać sabie ū hetym pieraškod, pierachodziačy z prawasłaūja ū katalictwa, abo z katalictwa ū prawasłaūje. Hetaje zdareńnie pakazwaje, što moładź prajawiła swoj wiasielny bajkot susiedcy za adračeńnie narodnaje, bo na tym wiasielli „maładaja“ z „maładym“ i „družboj“ nie hawaryła paswojmu, pabiełarusku. D. A.

USIAČYNA

Wałasnyja samaūradawyja budžety.

U śniežni kožnaha hodu wałasnaja Rada musić razhladać i zaćwierdzić swoj wałasny budžet na nastupny hod.

Treba wiedać, što wałasny budžet — heta haspadarčy plan pracy ū wołaści; wałasny budžet układajecca pawodle specyjalnaha zakonu, jak pa staranie raschodaū, taksama i pa staranie prychodaū.

Wałasny budžet — heta nie małaja sprawa ū hramadzkim žyćci wołaści. Dyk błaha pastupajuć tyja wałasnyja radnyja, što mała, abo i zusim nia cikawiacca hetaj sprawaj; kiepska pastupajuć i tyja hramadzianie wołaści, što nia cikawiacca budžetam swajej wołaści. Hetaj sprawaj pawinny cikawicca nia tolki wałasnyja radnyja z abawiazku, ale pawinny cikawicca i ūsie hramadzianie wołaści; tyja žychary wołaści, što płaciać padatki, pawinny być zacikaūleny i raschodami hetych padatkaū.

Woś-ža pawodle samaūradawaha zakonu z 6.XII.1932 h. ab wałasnych budžetach (Dz. Ust. N 11 — 1936) wałasnyja ūłady pawinny za 14 dzion prad budžetnym pasiedžańniem wałasnoj Rady padać da wiedama žycharoū wołaści ab ułaženni prajektu budžetu, jaki kožny žychar maje prawa pierahladać.

Hety zakon daje mahčymaść kožnamu zacikawicca wałasnoj haspadarkaj — paznajomicca z raschodami i dachodami budžetu, kab paśla źwiarnuć swaju ūwahu na hety budžet wybranym radnym, kab jany damahalisia na budžetnym pasiedžańni Rady ūwiadzieńnia ū pazycyi budžetu najbolš patrebnaha ū hramadzkim žyćci wołaści.

Našaja wioska maje šmat swaich patrebaū, jakija možna zaspakoić tolki arhanizawanym sposabam pracy: patrebnaja ū wioscy samaaświetnaja praca, patrebnyja biblijateki, patrebnyja narodnyja damy i h. d.

Z praktyki wiedajem, što hetkija patreby wioski mała dzie wałasnyja Rady biaruć pad uwahu. A heta tamu, što wałasnymi budžetami i ahułam žyćciom wałasnoha samaūradu našyja sialanie amal nia cikawiacca.

Treba wiedać, što biez padniaćcia haspadarčaj kultury, biez aświety, biez narodnych damoū dziela samaaświety, žyćcio sialanskaje nie paprawicca. Pryhetym treba zaūsiody pomnić, što narod pryswajwaje sabie kulturnyja wartaści tolki tady, kali z hetymi kulturnymi wartaściami nia łučycca palityka asymilacyi. Dziela hetaha samaaświeta sialanskich masaū pawinna być naładžana tolki ū rodnaj mowie — u biełaruskich siołach pabiełarusku.

Dyk cikaūmasia wałasnymi budžetami i trebujma, kab wałasny samaūrad dbaū i ab samaaświecie našaha, biełaruskaha sialanstwa.

Nowy zakon ab zapalwačkach i kamuškoch da ich.

Nowy zakon z 5.XI.1936 h. (Dz. Ust. N 84) ab mašynkach-zapalwačkach i kamuškoch da ich uwodzić kary:

1) chto pradaje, kuplaje abo maje nieštamplawanuju mašynku-zapalwačku — budzie karany štrafam ad 5 da 10 krotnaj sumy manapolnaha nałohu na zapalwački;

2) chto kuplaje, abo pradaje kamuški da zapalwački ū apakoūcy biez adpawiednaj manapolnaj banderoli — budzie karany štrafam ad 20 da 3.000zł.

Zabranyja hetkija zapalwački i kamuški padlahajuć kanfiskacie.

Redaktar A. Dasiukiewič Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ū Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutewič